# ПРЫМУСІМ ЗАГАВАРЫЦЬ ЛІЧБЫ

***З АКТАЎ РАССЛЕДАВАННЯ, ЯКОЕ ПРАВОДЗІЛІ ЛУНІНЕЦКІЯ І ЛЕНІНСКАЯ РАЁННЫЯ КАМІСІІ САДЗЕЙНІЧАННЯ Ў РАБОЦЕ НАДЗВЫЧАЙНАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ КАМІСІІ ПА РАССЛЕДАВАННЮ І ЎСТАНАЎЛЕННЮ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА - ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НА ЧАСОВА АКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ ЛУНІНЕЦКАГА І ЛЕНІНСКАГА РАЁНАЎ ПІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ.***




...У наваколлі **м. Лахва** выяўлена:

магіла размерам 25х2х2,5 м на зямлі Лахвенскага рыбгаса на адлегласці 50 м на захад ад прасёлачнай дарогі Лахва — хутары Перунова і 40 м на поўдзень ад чыгуначнай дарогі Лахва — Мікашэвічы, у якой пахаваны 1.946 чалавек яўрэйскага насельніцтва м. Лахва, у тым ліку 698 жанчын і 724 дзіцяці;

14 магіл розных памераў, размешчаных побач з яўрэйскімі могілкамі ва ўрочышчы „Паповая гара", у якіх захаваны 189 чалавек мясцовага насельніцтва, у тым ліку 77 жанчын і 34 дзіцяці, 283 ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі.

Ва ўрочышчы „Паповая гара" нямецкія захопнікі на працягу акупацыі расстрэльвалі і закопвалі трупы, а таксама асобных савецкіх грамадзян і ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі.

У наваколлі **м. Кажан - Гарадок** выяўлена:

магіла размерам 12х4х3 м, прымыкаючая да ўсходняга боку яўрэйскіх могілак, у якой захаваны 937 чалавек, у тым ліку 325 жанчын і 301 дзіця.

З паказанняў сведкаў і апытання мясцовых жыхароў устаноўлена:

3 верасня 1942 г. нямецкай жандармерыяй было вывезена з гета м. Кажан - Гарадок яўрэйскае насельніцтва, да загадзя выкапанай побач з яўрэйскімі могілкамі ямы, дзе немцы здзейснілі такую ж расправу над яўрэямі, як і ў м. Лахва. Акрамя яўрэяў, на працягу акупацыі нямецкія захопнікі расстралялі 21 савецкага грамадзяніна, у тым ліку 8 жанчын і 4 дзяцей, пахаваных мясцовым насельніцтвам на хрысціянскіх могілках.

З апытання мясцовага насельніцтва Лунінецкага раёна ўстаноўлена:

у **в. Дзятлавічы** ў ліпені 1941 г. нямецкія каты масава расстралялі 33 савецкіх грамадзян, у тым ліку 12 жанчын і 10 дзяцей, а на хутарах гэтай вёскі 17 кастрычніка 1943 г. імі былі спалены 148 чалавек, у тым ліку 51 жанчына і 57 дзяцей,і расстраляна 68 чалавек, у тым ліку 20 жанчын і 14 дзяцей, якіх нямецкія каты спалілі разам з іх гаспадаркамі;

у **в. Бастынь** 18 ліпеня 1942 г. расстраляны 89 чалавек;

7 снежня 1942 года ў **в. Ракітна** немцамі расстраляны 83 чалавекі і пахаваны ў магіле размерам 5х3х3 м на полі Караваевіча Фёдара Ерамеевіча ў 500 м на ўсход ад вёскі;

у жніўні 1941 г. у **в. Вялікія Чучавічы** масава расстраляны 84 савецкія грамадзяніны і 146 ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі;

20 ліпеня 1942 г. ў **в. Вулька 1** расстраляны 91 чалавек;

у **в. Белае Возера** 19 студзеня 1944 г. расстраляны 57 чалавек;

у **в. Бродніца** за час акупацыі расстраляны 34 чалавекі;

вясной 1943 г. у **в. Добрая Воля** расстраляны 73 чалавекі і спалены жывымі 98 чалавек;

1 кастрычніка 1943 года ў **в. Мелясніца** спалены 240 чалавек разам з іх гаспадаркамі;

на хутарах восенню 1943 г. немцы спалілі жывымі 82 чалавекі мясцовых жыхароў, у маі і лютым 1943 г. немцы спалілі 39 мясцовых жыхароў.

Такую практыку тэрора за час акупацыі Лунінецкага раёна нямецка - фашысцкія каты праводзілі ў шэрагу іншых населеных пунктаў Лунінецкага раёна. У вёсках Язвінкі, Замошша, Цна, Дрэбск, Вулька 2, Азярніца, Любачын, Чырвоная Воля, Засценак, Замлынне, Лобча, на хутары Андрушкова і іншых населеных пунктах расстраляны 3.554 чалавекі, якіх у большасці вывозілі і расстрэльвалі ў невядомых месцах.

За перыяд часовай акупацыі тэрыторыі Лунінецкага раёна ў горадзе Лунінцы і населеных пунктах Лунінецкага раёна нямецка - фашысцкія захопнікі расстралялі 12.453 чалавекі мірных савецкіх грамадзян, у тым ліку 4.437 жанчын і 3.674 дзіцяці, павесілі 132 чалавекі, у тым ліку 11 жанчын, спалілі жывымі 607 чалавек, у тым ліку 203 жанчыны і 221 дзіця, забілі і замучылі ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі 3.242 чалавекі, пагналі ў нямецкае рабства 2.319 чалавек, з іх 1.441 мужчыну і 878 жанчын, загінулі ў выніку нямецкай паветранай бамбардзіроўкі 203 чалавекі.

Выканаўцамі вышэйпералічаных злачынстваў з'яўляюцца: начальнік Лунінецкай жандармерыі Лепен, немец; Вілі Шэферэр, немец (па мянушцы Пушына); загадчык гаспадарчай часткі Лунінецкага раёна Крэсляндвірт; намеснік начальніка райупраўлення Гюга Карлавіч Міллер, немец.

**10 сакавіка 1945 г.**
**г. Лунінец.**

**Яшчэ раз звяртаемся да вас, старшакласнікі вышэйназваных вёсак. Пакуль сёння яшчэ жывыя відавочцы і сведкі гэтых трагічных падзей, вы ў стане аднавіць імя, прозвішча і ўзрост загінуўшых землякоў, вашых недалёкіх продкаў. Давайце расшыфруем гэтыя жудасныя лічбы, давайце прымусім іх загаварыць чалавечымі галасамі, каб аб'ектыўна адлюстраваць перыяд фашысцкай акупацыі на Лунінеччыне. Заўтра можа быць позна. Няпоўную праўду ў кан'юнктурных мэтах лёгка ператварыць у няпраўду. Давайце не дапусцім гэтага. Вы можаце і вы павінны аднавіць паіменныя спісы мірных ахвяр фашызму.**